**Беларуская народная гульня “Чэпел”**

*Гучыць фанаграма народнай музыкі.*

*На сцэне з’яўляюцца хлопчык і дзяўчынка (вядучыя-ўдзельнікі) ў нацыянальным адзенні. Яны па чарзе чытаюць верш.*

**Вядучая:** Край наш любімы, вясёлы, багаты.
Гасцей тут чакаюць утульныя хаты.
**Вядучы:** А ў хатах, з прад веку вякоў так вялося,
Каб добра і весела ўсім нам жылося,
**Вядучая:** З павагай сустрэнуць за ўсёды гасцей,
Каб тыя наведваліся часцей!
**Вядучы:** За стол запросяць і пачастуюць,
Страў самых смачных не пашкадуюць!
**Вядучая:** А потым запросяць на круг пагуляць,
Сябры, паверце, ёсць чым здзіўляць!
**Вядучы:** Гульня ўвялікую спадчыну маем.
Знамі гуляцьусіх запрашаем!

*Вядучыя-удзельнікі разыходзяцца па розных баках.*

*Гучыць музыка (гармонік). З’яўляецца моладзь (юнакі і дзяўчаты у нацыянальным адзенні), пачынаюць дыялог, нібыта спрачаюцца.*

- Прывітанне!
- Прывітанне!
- Працавалі цяжка ў ранні!
- Ды і ў дзень мы не ляжалі!
-Час настаў, кааб пагулялі!
- Во, давайце ў “Рамня!”
- Бі, Васіль, свайго каня!
- Не, давайце ў “Яечка”.
- Галаватвая , як печка,
А мо,нават, і як пень!
Сення не Вялік жа Дзень!
- Трэба нам гульню абраць,
Каб і танчыць, і спяваць…
Каб душою стаў я весел!
**Усе:** Дык давайце гуляць у Чэпел!

- Гэта добрае рашэнне!
Пакажу і спрыт, і ўменне.
- Усё! Бяжым за чапялой!

*Вядучы праводзіць лічылку!*

Раз сустрэўся гусь з лісой.
Уцякай хутчэй наўскач.
Правілы гульні тлумач!

*Усе ўдзельнікі разбягаюцца па баках, а той, хто застаўся, тлумачыць правілы гульні.*

-Усе пабеглі па дамам.
Вам, сябры, парады дам,
Як у Чэпела гуляць-
Трэба шмат гульцоу сабраць,
На каманды падзяліць,
Рыску тут жа начарціць.

*Дзеці вяртаюцца з чапёламі і выстрайваюцца на сцэне ў радок, падзяліўшыся на каманды хлопчыкаў і дзяўчынак.*

-Хто налева, хто направа.
Перашкаджаць не маем права.
Вось вярнуліся гульцы.
Яны проста малайцы!
Прынясли з сабой чапёлы.
Вось настой будзе вясёлы!

*Гульцы выкладваюць з чапёл 2 крыжы, вядучая знаёміць удзельнікаў з правіламі (дэманструе рухі) і словамі песні, якая будзе суправаджаць гульню.*

-З чапёл крыжыкі складаем
І ўсе дружна заспявем:

А ў лесе зайка прабягае!
А ў полі жыта прарастае,
Чэпел, чэпел, чэпел знае,
Што ў полі жыта прарастае!

**Дзяўчынка:**Зразумела! Не складана!
Выклікаю я Сцяпана!

*Два удзельнікі прыгаюць па між чапёл, а ўсе астатнія, паступова паскараючы тэмп, спяваюць песню і, задаючы рытм, пляскаюць у далоні.*

*Гульня працягваецца да таго часу, пакуль нехта з гульцоў не памыляецца.*

*Удзельнік, што першым дапусціў памылку, выконвае пажаданне пераможцы.*

**Пераможца:** Я скакаў, стараўся вельмі,
Пацалунак хачу ад Лены!

**Наступны удзельник:** Хлопцы, вас не падвяду!
З Светай бітву павяду!

*Затым надыходзіць чарга іншых гульцоў, пакуль усе не паўдзельнічаюць.*

**Вядучы:**Час гульніўмігпраляцеў!
Мо з вас, сябры, хтопагуляцьзахацеў?

**Вядучы:**Не саромцесь, пачынайце!
Ну, а нас не забывайце!